Ю.А.Стральцоў, У.А.Разумны і інш. Разгледжаныя падыходы да класіфікацыі дазваляюць вывучыць асаблівасці кожнага віду гульняў, звярнуць увагу на спецыфічныя прыкметы, іх падзел і абгрунтаваць свой варыянт іх класіфікацыі. Мы прапануем класіфікацыю гульняў, якая, на наш погляд, больш адпавядае іх практычнаму выкарыстанню ў арганізацыі вольнага часу.

У нашай класіфікацыі мы вылучаем 4 групы гульняў: арганізацыйна-дзейнасныя, пазнавальныя, імправізацыйна-творчыя, гульні для фізічнага развіцця. Асаблівасцю арганізацыйна-дзейнасных гульняў з'яўляецца тое, што яны ствараюць поле дзейнасці, у якім апрабуюцца і накіравана фарміруюцца спосабы ўстанаўлення дзелавых, сацыяльна-ролевых узаемаадносін паміж удзельнікамі. Змест гульні вызначаецца тыпам прафесійнай дзейнасці, задачамі і асаблівасцямі выканання гульнявых дзеянняў, гульнявых імітацый.

Другую групу гульняў складаюць пазнавальныя, ці інтэлектуальныя, гульні. Іх асаблівасць заключаецца ў тым, што набытыя ўменні, прыёмы і навыкі на аснове гульнявой формы прымяняюцца ў рэальным пазнавальным працэсе. Да дадзенай групы гульняў мы адносім віктарыны, гульні-тэсты, рэбусы, крыжаванкі, анаграмы, шахматы і шашкі, гульні-аўкцыёны і інш.

Наступная група гульняў -- імправізацыйна-творчая. Асаблівасць дадзенай групы ў тым, што яны даюць магчымасць іх удзельнікам паспрабаваць сябе ў іншай ролі, ва ўмовах поўнай свабоды, садзейнічаюць устанаўленню неабходных узаемаадносін з партнёрамі па гульні і тым самым дазваляюць самарэалізаваць творчы патэнцыял асобы. Імправізацыйна-творчыя гульні маюць на ўвазе дзейнасць іх удзельнікаў ва ўмовах двухпланавай сітуацыі. З аднаго боку, ажыццяўляюцца рэальныя дзеянні, а з другога боку, шэраг момантаў гэтай дзейнасці носяць умоўны характар. Пры гэтым сама ўмоўнасць не абстрактная, а суаднесена з якой-небудзь рэальнасцю, якая мадэліруе яе асноўныя характарыстыкі.

Чацвёртую групу гульняў складаюць гульні фізічнага развіцця. У працэсе гэтых гульняў выпрацоўваюцца нормы паводзін і ўзаемаадносін ва ўмовах пэўнай рэгламентацыі. Характэрнымі асаблівасцямі дадзенай групы гульняў з'яўляюцца іх спаборніцкі характар, магчымасць мабілізаваць фізічныя здольнасці і валявыя якасці асобы.

Распрацаваная класіфікацыя гульняў не з'яўляецца дасканалай, аднак для сферы вольнага часу, на наш погляд, найбольш прымальная.

Корбут А.А.,
сацыяльны педагог
СШ N 159 г.Мінска

## ГУЛЬНЕТЭРАПІЯ ЯК МЕТАД РАБОТЫ ШКОЛЬНАГА САЦЫЯЛЬНАГА ПЕДАГОГА

Спецыяльныя даследаванні паказваюць, што ў дзяцей сустракаецца мноства цяжкасцей псіхалагічнага плана, якія патрабуюць своечасовага выяўлення і карэкцыі. Гэта, напрыклад, страта вучэбнай матывацыі, нізкая паспяховасць, неарганізаванасць, канфліктныя сітуацыі з настаўнікамі і аднагодкамі, нізкая самаацэнка, схільнасць да ўдзелу ў асацыяльных групіроўках, разнастайныя формы неардынарных паводзін і інш. У залежнасці ад змястоўна-псіхалагічнай накіраванасці карэкцыі ў рамках нармальнага антагенетычнага развіцця трэба адрозніваць:

- карэкцыю разумовага развіцця;
- карэкцыю развіцця асобы;
- карэкцыю і прафілактыку развіцця неўратычных стапаў і неўрозаў.

У залежнасці ад форм арганізацыі псіхалагічнай дапамогі з мэтай вырашэння карэкцыйных задач у працы сацыяльнага педагога можна вызначыць тры яе віды: лекцыйна-асветніцкую, кансультатыўна-рэкамендацыйную і ўласна карэкцыйную работу у форме індывідуальнай і групавой карэкцыі.

Спынімся больш падрабязна на характарыстыцы гульнетэрапіі як найбольш універсальнай формы карэкцыі ў малодшым школьным узросце.

Гульнявая дзейнасць у гэтым узросце можа быць з поспехам выкарыстана як для карэкцыі асобы дзіцяці, так і для развіцця яго пазнавальных працэсаў, фарміравання ідэальнага (унутранага) плана дзеянняў, мыслення, памяці, маўлення, развіцця зносін. Таму без перабольшання можна сказаць, што гульня ў гэтым узросце з'яўляецца універсальнай формай карэкцыі, забяспечваючы і высокі ўзровень матывацыі ўдзелу ў карэкцыйных занятках, і шырокія магчымасці мэта накіраванага фарміравання розных формаў псіхічнай дзейнасці.

Тэарэтычныя меркаванні былі праверany ў практычнай дзейнасці сацыяльнага педагога з дзецьмі 8-гадовага ўзросту.

Мы паспрабавалі распрацаваць методыку псіхакарэкцыйнай работы з малодшымі школьнікамі сродкамі гульні, г.з. вызначаную сістэму гульняў, якія спрыяюць карэкцыі некаторых цяжкасцей псіхалагічнага характару. Пры падборы гульняў мы максімальна ўлічвалі інтарэсы, схільнасці і пажаданні дзяцей. Акрамя таго, мы вывучылі практычныя навыкі даследуемых намі дзяцей. Гэта дазволіла змадэліраваць сітуацыі, якія забяспечылі б поспех дзяцей у працэсе гульнявой дзейнасці. Мы распрацавалі серыю конкурсаў, аб'яднаных агульнай назвай «Сваімі рукамі».

Былі праведзены такія гульні, як «Перабежкі», «Перадача мяча ў калоне», «Вароны і вераб'і», «Паштачкі», а таксама беларускія народныя гульні «Беларуская бульба», «Палескія пастушкі», «Слуцкія паясы» і іншыя.

Улічваючы цікавасць да казак у гэтым узросце, мы зрабілі віктарыну па любімых дзіцячых казках.

Асаблівую увагу надаем сюжэтна-ролевым гульням. Адна з такіх гульняў -- «Заапарк». Дзецям прапануюцца ролі розных звяроў. Трэба паказаць голасам, паходкай звычкі, паводзіны і характар звяроў.

Такім жа чынам праводзяцца гульні «Калабок», «Церамок», «Іншапланецяне» і іншыя.

Пасля працяглага прымянення такіх «сеансаў гульнетэрапіі» (каля года) мы заўважылі, што актыўнасць дзяцей у гульні значна павысілася, многія адкрылі сябе з новага боку. І, што самае каштоўнае, настаўнікі заўважылі дынаміку актыўнасці на ўроках.

Усё гэта дае падставу зрабіць вывад, што распрацаваная сістэма гульняў дазваляе ў некаторай ступені наблізіць псіхічны стан даследуемых дзяцей да нормы.

Безумоўна, распрацаваная намі методыка патрабуе больш працяглага прымянення. Гэта, натуральна, дазволіць дасягнуць істотных вынікаў у карэкцыі псіхічнага развіцця дзяцей.

Шаўцоў А.П.,
выкладчык

## КУЛЬТУРАЛАГІЧНАЯ ПАТРЭБА ВЫВУЧЭННЯ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКАЙ САЦЫЯЛЬНА-ПЕДАГАГІЧНАЙ ДУМКІ

Праблема даследавання гісторыі беларускай сацыяльна-педагагічнай думкі наколькі надзённая, настолькі і малавывучаная, бо ў мінулыя часы з-за шэрагу аб'ектыўных і суб'ектыўных прычын ёй сур'ёзна і глыбока не займаліся. Усё, што стваралася лепшымі прадстаўнікамі беларускага народа, у большасці выпадкаў папросту ці забывалася, ці працавала на іншую культуру. Відавочна, што такі стан вывучанасці гісторыі беларускай сацыяльна-педагагічнай думкі не можа задавальняць сучасную навуку аб выхаванні асобы.

Неабходным і важным, на наш погляд, з'яўляецца разгляд пытанняў выхавання асобы не толькі ў кантэксце гістарычнага развіцця педагогікі, але і ў кантэксце культуралогіі. Выклікана гэта, у першую чаргу, тым, што працэсы выхавання вельмі пашырыліся і ўдзел у іх прымае ўсё грамадства цалкам. Праявы гэтага ўдзелу самыя розныя: ахвяраванні грошай на тыя ці іншыя патрэбы выхаваўчых устаноў, канкрэтная дапамога ў арганізацыі вольнага часу, міласэрны клопат і апекаванне ды шмат чаго іншага. Усе гэтыя формы сацыяльна-педагагічнай работы сталі набыткамі грамадства, і таму ўяўляецца патрэбным прааналізаваць іх з мэтай асэнсавання і ўсведамлення на сучасным этапе, высвятлення хібаў і здабыткаў выхаваўчых з'яў мінулага, у якіх адлюстраваны шматлікія напрамкі і падыходы ў выхаванні на розных гістарычных этапах жыццядзейнасці народа.

Трэба адзначыць таксама, што патрэба ў культуралагічным падыходзе да вывучэння гісторыі беларускай сацыяльна-педагагічнай думкі актуальная яшчэ і тым, што ў будучым (зразумела, пры спрыяльных абставінах і ўсебаковай падтрымцы і развіцці) сацыяльная педагогіка займе адно з галоўных месцаў у выхаванні і адаптацыі асобы да складаных умоў жыцця. Гэта звязана з тым, што як навука сацыяльная педагогіка ў сваёй аснове адкрытая для любых новых ідэй, новых напрамкаў дзейнасці і мае патэнцыяльныя магчымасці чуйна рэагаваць на змены ў грамадстве і развівацца разам з ім.

Падсумоўваючы выкладзенае, трэба сказаць, што гэта вялікая і карпатлівая праца патрабуе дэталёвага даследавання гістарычнай спадчыны, разгляду магчымасцей выкарыстання некаторых ідэй і формаў сацыяльнай работы мінулага ў сённяшнім часе, прыцягнення шырокага кола навукоўцаў з розных галін навукі для абмеркавання праблем гісторыі сацыяльна-педагагічнай думкі.

Залатар В.А.,
выкладчык

## ФАРМІРАВАННЕ МАСТАЦКАГА ЎСПРЫМАННЯ Ў ПРАЦЭСЕ ТЭАТРАЛЬНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ АСОБЫ

Спецыфіка тэатральна-творчай дзейнасці абумоўлівае своеасаблівы падыход да рашэння праблемы кіравання працэсам фарміравання мастацкага ўспрымання асобы. Разнастайнасць метадалагічных падыходаў парараджае праблему выбару найбольш адэкватных і перспектыўных методык, якія ўлічваюць спецыфіку тэатральнага мастацтва і працэсу тэатральнай дзейнасці. У мадэліраванні навучальна-творчага працэсу важна ўлічваць метад і спосаб пазнання тэатра, асноўныя заканамернасці рэальных працэсаў і з'яў сцэнічнай творчасці. Мадэліраванне праграм тэатральных гурткоў адлюстроўвае структуру і змест творчага працэсу і тэхналагічнае забеспячэнне кожнага структурнага кампанента. Тэхналагічны працэс уключае сістэму мэтазгодных і паслядоўных уменняў для атрымання жаданага выніку. Фарміраванне мастацкага ўспрымання сродкамі тэатральнага мастацтва будзе найбольш паспяховым толькі ў той дзейнасці, якая патрабуе творчых адносін да сябе,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ